Спадчына традыцыйнай культуры – не застылая форма, яна тая матрыца, якая надае рух культуратворчасці ў сучасных варунках. Можна пагадзіцца з выказваннем аб тым, што «глабальную цывілізацыю, у якой прымуць удзел грамадзяне свету, патрэбна будзе вырошчваць з мясцовых прывязанасцей, са змястоўных культурных спрэчак; з пераасэнсавання «нашай» ідэнтычнасці; са звычкі да дэмакратычнага эксперыментавання з пабудовай і перабудовай інстытутаў» [5, с. 220]. Традыцыя – гэта зусім не эквівалент традыцыйнай культуры, што адрозніваецца ад тэхнагеннай, гэта надзейны падмурак уваходжання ў цывілізацыю будучага.


1. *Кнабе, Г. С.* Двуединство культуры / Г. С. Кнабе // Материалы к лекциям по общей теории культуры и культуры античного Рима / Г. С. Кнабе. – М., 1993. – С. 25–37.

2. *Кутырев, В. А.* Культура и технология: борьба миров / В. А. Кутырев. – М. : Прогресс-Традиция, 2001. – 239 с.

3. *Вебер, Альфред.* Избранное: Кризис европейской культуры / Альфред Вебер. – СПб. : Университетская книга, 1999. – 565 с.

4. *Лем, Станислав.* Сумма технологии / Станислав Лем. – М. ; СПб. : Terra Fantastika, 2006. – 668 с.

5. *Бенхабиб, Сейла.* Притязания культуры / Сейла Бенхабиб. – М. : – 2005. – 350 с.



***Д. А. Крывашэй,***
*канд. гістарычных навук, дац.,*
*дац. каф. філасофіі Інстытута гісторыі*
*НАН Беларусі*


# ТРАНСФАРМАЦЫЯ МАДЭЛІ ДЗЯРЖАЎНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў БЕЛАРУСІ Ў НАВЕЙШЫ ЧАС (1991–2010)

Рэалізацыя культурнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь у першай палове 1990-х гг. адбывалася ў складаных сацыяльна-эканамічных умовах. Суворыя ўмовы крызісу, спробы пабудовы рынкавай эканомікі зрабілі папулярнымі ліберальныя ідэі. У сферы культуры гэта знайшло адлюстраванне ў дэклараванні раўнапраўя і роўнасці ўсіх суб’ектаў культурнай дзейнасці, значным зніжэнні ступені ўдзелу дзяржавы ў рэгуляванні эканамічных працэсаў, адмове ад разнастайнай дзяржаўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падтрымкі ўстаноў культуры і работнікаў сферы [15, с. 5]. У пераходны перыяд да рынкавай эканомікі асноўная задача дзяржаўнай культурнай палітыкі бачылася ў захаванні культурнага патэнцыялу нацыі і кантролі над зменамі, якія адбываліся ў сферы культуры [8, с. 36–41]. Адбылося скарачэнне сацыяльна-творчага заказу, праводзілася ліквідацыя і аптымізацыя сеткі ўстаноў культуры, перадача аб'ектаў з рэспубліканскай ў камунальную ўласнасць. Побач з гэтым у Беларусі былі створаны юрыдычныя падмуркі для развіцця прыватнай ініцыятывы ў галіне культуры. У той час у краіне дзейнічаў шэраг незалежных тэатраў-студый, у г. Гомелі быў заснаваны прыватны тэатр, пашырылася антрэпрыза, дзейнічалі незалежныя кінастудыі, прыватныя галерэі.

Некаторыя змены ў арыенцірах дзяржаўнай культурнай палітыкі адбыліся ў 1996 г. Творчыя саюзы ў той год пазбавіліся вызвалення ад выплаты падатку на прыбытак. Гэты крок дзяржавы яўна дэманстраваў намер паставіць гэтыя суб'екты ў роўныя ўмовы гаспадарання з іншымі недзяржаўнымі арганізацыямі. Але да роўнасці яшчэ было далёка – фінансаванне іх дзейнасці працягвалася з дзяржаўнага бюджэту.

У тым жа годзе была зменена арганізацыйна-прававая форма фінансавання дзяржаўных устаноў культуры. Дзяржава адмовілася ад «новага гаспадарчага механізму», увяла нарматыўнае фінансаванне, якое было дэталізавана па асобных артыкулах класіфікацыі. Гэта значна звузіла прававое поле і фінансавыя магчымасці дадзеных аб'ектаў. У той жа час быў заснаваны першы буйны дзяржаўны Фонд падтрымкі таленавітай моладзі. Падтрымка творцаў праявілася ў дазволе ў чэрвені 1997 г. Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь устанаўліваць вядучым майстрам мастацтваў персанальныя аклады з надбаўкамі да 100 % у межах сродкаў аплаты працы [9].

Кіраўнік дзяржавы ў 1997 г. паставіў задачу «фарміравання цэльнай канцэпцыі дзяржаўнага рэгулявання і падтрымкі развіцця культуры» [6, с. 2]. Гэта можна расцаніць як наступны крок да карэкціроўкі ліберальнай рыначнай мадэлі ў бок сацыяльна-дэмакратычнай. У 1998 г. пачаў дзейнічаць Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Акрамя гэтага былі заснаваны спецыяльныя прэміі Прэзідэнта за высокія творчыя дасягненні, а таксама гранты на стварэнне твораў культуры і мастацтва. «Нацыянальнай культуры не вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыць без актыўнага удзелу дзяржавы ў яе лёсе», – адзначалася ў Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь у 1999 г. [7, с. 2].

А вось камерцыйны сектар сутыкнуўся з непрадбачанымі цяжкасцямі. У 1998 г. было ўведзена ліцэнзаванне гастрольна-канцэртнай дзейнасці. Ад платы за ліцэнзію былі вызвалены філармоніі, калі яны займаліся сваёй асноўнай дзейнасцю ў межах статуту.

У пачатку 2000-х гг. у адносінах да дзяржаўных устаноў культуры больш заўважальнымі сталі патэрналісцкія пазіцыі дзяржавы. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў значным павелічэнні ролі бюджэтнага фінансавання, узмацненні кантролю дзяржавы за выкарыстаннем бюджэтных сродкаў і імкненні да «навядзення парадку» ў галін [10, 13]. У 2000 г. быў уведзены казначэйскі кантроль над размеркаваннем бюджэтных сродкаў. Асноўным метадам планавання і размеркавання іх на ўзроўні ўстаноў культуры стаў каштарысны. Гэта прывяло да росту ўтрыманскіх пазіцый работнікаў і кіраўнікоў, страце імі зацікаўленасці ў пошуку новых крыніц сродкаў і рэалізацыі новых творчых праектаў.

На гэты перыяд прыпадае істотнае скарачэнне ў 2002 г. сеткі ўстаноў культуры, якога не было нават ў крызісныя 1998–1999 гг. Напрыклад, калі за 1998–1999 гг. адбыўся нязначны рост сеткі клубаў (на 29 адзінак), то толькі за 2002 г. былі зачынены 262. За 2002 г. колькасць работнікаў галіны скарацілася на 2570 адзінак, ці больш за 4 %, а ў апараце кіравання – на 10 % [5].

На мяжы стагоддзяў былі адзначаны спробы рэалізацыі больш шырокага ўдзелу творчай інтэлігенцыі ў правядзенні дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і мастацтва. У 2000 г. была створана грамадская рада па праблемах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (з 2002 г. – пры Міністэрстве культуры). З 40 яе удзельнікаў толькі тры прадстаўлялі творчыя саюзы. Дзейнасць Рады была нядоўгай і незаўважнай. Прыцягненне грамадскасці да прыняцця рашэнняў атрымала прававое забеспячэнне асобным артыкулам новай рэдакцыі Закона «Аб культуры» у 2004 г. Аднак ніякіх канкрэтных крокаў па рэалізацыі доўга не здзяйснялася.

У першай палове 2000-х гг. адбыўся пераход ад мадэлі роўных магчымасцей усіх суб'ектаў культурнай палітыкі да відавочнай падтрымкі дзяржаўнага сектару. Ад гэтага пацяр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пелі нават творчыя саюзы. Калі ў 2001 г. яны былі вызвалены ад выплаты падаткаў на прыбытак і на дабаўленую вартасць, то ў 2002 г. рэзка скараціліся бюджэтныя асігнаванні на іх дзейнасць. У выніку саюзы сталі існаваць выключна за кошт членскіх складак, а кіраўнічы апарат – працаваць фактычна на грамадскіх пачатках.

У 2003 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь даручыў узмацніць ролю дзяржаўных канцэртных арганізацый ў здзяйсненні гастрольна-канцэртнага абслугоўвання насельніцтва. З вуснаў міністра культуры прагучала заява аб неабходнасці «стварэння самых добразычлівых умоваў для працы дзяржаўных канцэртных арганізацый» [1, с. 46]. У выніку змены ўмоваў дзейнасці «аказалася поўнасцю ліквідавана беларуская недзяржаўная тэатральная ініцыятыва. Загінулі ўсе антрэпрызы…» [3].

Адным з крокаў па забеспячэнні бюджэтнага фінансавання культуры стала ўвядзенне ў 2003 г. нарматыўна-мэтавага падыходу да фінансавання ўстаноў культуры. У яго аснову быў пакладзены мінімальны сацыяльны стандарт па культуры.

Аб узмацненні ўвагі дзяржавы да выканаўцаў сведчаць факты. У 2003 г. была ўведзена 50 % квота на гучанне беларускай музыкі ў эфіры. У 2005 г. яна была павялічана да 75 %. У той жа час асобныя групы і выканаўцы ў 2004 г. патрапілі ў так званыя чорныя спісы, што стварыла ім цяжкасці з арганізацыяй канцэртаў і ратацыяй у эфіры радыёстанцый. Ім перасталі выдаваць гастрольныя пасведчанні.

Другая палова 2000-х гг. вызначаецца некаторай лібералізацыяй адносін дзяржавы і творцаў. У 2007 г. у Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча з лідэрамі гуртоў «Крама», «N.R.M.», «Палац» і «Нейра Дзюбель» [11]. Пасля яе гурты атрымалі магчымасць выступаць з канцэртамі на тэрыторыі краіны. Пазней Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь назваў культуру «сферай, якая валявым рашэннем ці ўказаннем зверху не развіваецца» [4]. А задача дзяржавы – фарміраваць асяроддзе, спрыяльнае для творчасці. Упершыню ў кантэксце развіцця дзяржаўна-грамадскага кантролю было заяўлена, што для фарміравання сацыяльна актыўнай асобы неабходна эфектыўна выкарыстоўваць патэнцыял культуры [12]. У гэтым напрамку важным бачылася адраджэнне краязнаўчай працы.

У гэты ж перыяд адбылося істотнае скарачэнне дзяржаўнай бібліятэчнай сеткі, якія фактычна і былі цэнтрамі краязнаўчай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы. У перыяд 2007–2009 гг. было ліквідавана 460 бібліятэк (з іх 198 на сяле). Фактычна ў канцы 2000-х гг. у краіне была ліквідавана кожная дзясятая бібліятэка (на сяле – кожная шостая) [5].

Адначасова працягвалася наступленне на прыватны сектар. У 2008 г. рэгламентацыя дасягнула фірм, якія аказвалі паслугі па арганізацыі вольнага часу грамадзян. Апошнія павінны былі атрымліваць пасведчанні на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства. У мэтах узмацнення кантролю за якасцю праграм такіх мерапрыемстваў упраўленні культуры стваралі мастацка-экспертныя камісіі (рады).

У гэты ж перыяд актывізаваліся намаганні дзяржаўных органаў улады па далучэнні грамадзян да рашэння дзяржаўных справаў. У 2009 г. было заяўлена аб неабходнасці эфектыўнага выкарыстання патэнцыялу культуры для фарміравання сацыяльна актыўнай асобы [12]. У 2008 г. прадстаўнікі грамадскіх арганізацый былі ўключаны ў склад створанай грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыне. У канцы 2010 г. аднавіла дзейнасць Рада па культуры і мастацтве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У той жа час Кіраўніком дзяржавы была звернута ўвага на неабходнасць больш эфектыўнага выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў на падтрымку культуры і мастацтва, спалучэнне фінансавання з той ідэалагічнай і творчай аддачай, якую атрымлівае ад іх грамадства. Адначасова была пастаўлена задача сфарміравання сістэмы, здольнай павялічыць прыток пазабюджэтнага інвесціравання ў культуру [14]. Пасля доўгага забыцця зноў загаварылі аб стымуляванні спонсарства і мецэнацтва.

Такім чынам за дваццаць гадоў мадэль дзяржаўнай культурнай палітыкі ў Беларусі трансфармавалася ад ліберальна-дэмакратычнай да сацыял-дэмакратычнай з уласцівым ёй абмежаваным рэгуляваннем эканамічных працэсаў, сацыяльнай арыентаванасцю эканомікі і стварэннем магутнага дзяржаўнага сектару. У канцы вывучаемага перыяду ў сістэме адносін ўлады і сферы культуры ўсё болей сталі прасочвацца тэндэнцыі дзяржаўнага патэрналізму.

---

*1.* Архіў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Пратаколы № 1–2 пасяджэнняў калегіі міністэрства за 2004 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2.* Выступление А. Г. Лукашенко на совещании «О мерах по решению проблем развития культуры и искусства» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.president.gov.by/press10266.html. 2001.

*3. Давыдзька, Генадзь.* Сённяшнія дэпутаты – не баязлівыя людзі / Генадзь Давыдзька // Звязда. 2005. – 8 снежня. – С. 3.

*4.* Ежегодное Послание Президента Беларуси белорусскому народу и Национальному собранию Республики Беларусь [Электронны рэсурс]. – 30.04.2008. – Рэжым доступу: http://www.president.gov.by/press57289.html#doc.

*5.* Інтэграваны банк дадзеных установ культуры. 02072096.АИС.001 [Электронны інфармацыйная сістэма]. Рэгістрацыйнае пасведчанне № В-0009-01-2010. Уладальнік – Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Інстытут культуры Беларусі».

*6. Лукашенко, А. Г.* Мы все в ответе за нашу Беларусь. Ежегодное послание Президента Республики Беларусь Национальному собранию Республики Беларусь / А. Г. Лукашенко // Советская Белоруссия. – 1997. – 15 апреля. – С. 2.

*7. Лукашенко, А. Г.* Послание Президента Национальному собранию / А. Г. Лукашенко // Советская Белоруссия. – 1999. – С. 1–3.

*8.* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 974, воп. 4, спр. 1.

*9.* Об установлении персональных окладов ведущим мастерам искусств: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 16 июня 1997 г., № 715 // Збор дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта і пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь. – 1997. – № 17–18. – Арт. 634.

*10.* Обращение Президента Республики Беларусь А. Лукашенко с посланием белорусскому народу и Национальному собранию [Электронны рэсурс]. – 19.04.2005 – Рэжым доступу: http://www. president.gov.by/press13483.html#doc.

*11. Панямонаў, Зміцер.* Праляскоўскі паабяцаў зняць забарону з беларускіх рокераў і пусціць іх на БТ / Зміцер Панямонаў [Электронны рэсурс]. – 21.11.2007. – Рэжым доступу: news.tut.by/culture/98438.html.

*12.* Послание белорусскому народу и Национальному собранию Республики Беларусь [Электронны рэсурс]. – 23.04.2009 – Рэжым доступу: http://www.president.gov.by/press70397.html#doc.

*13.* Послание Президента Беларуси Александра Лукашенко Парламенту [Электронны рэсурс]. – 14.04.2004 – Рэжым доступу: http://www.president.gov.by/press10866.html#doc.

*14.* Послание Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию [Электронны рэсур]. – 21.04.2010 – Рэжым доступу: http://www. president. gov.by/press10256.html

*15. Рылатка, Ул.* Некаторыя пытанні культурнай палітыкі на сучасным этапе / Ул. Рылатка // Чалавек. Культура. Эканоміка: матэрыялы навук. канфер., Мінск, 21–22 ліст. 1996 г. / Белар. ін-т праблем культуры ; навук. рэд. А. Я. Міхневіч. – Мінск : БелІПК, 1997. – С. 3–8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ